# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 4(46) 2005**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**



***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў


## Змест


***Гісторыя***

*Пуцік У. С.* Таварыствы сельскай гаспадаркі Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX — пачатку XX ст. (агляд матэрыялаў пасяджэнняў) ...... 3

*Груца І. А.* Гісторыя пошукаў «скарбаў Напалеона» на р. Бярэзіне ..... 8

*Мацеюк В. П.* Роль еўбюро пры ЦК КП(б)Б у паляпшэнні эканамічнага становішча яўрэйскага местачковага насельніцтва ........ 13

*Радаман А. А.* Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI — пачатку XVII ст. ..... 16

*Сувалаў А. М.* Крытэрыі вызначэння этнічнай прыналежнасці беларусаў у славянскай гістарыяграфіі XIX — пачатку XX ст. ........ 21

*Мацюш П. А.* Гістарычная адукацыя ў сістэме вышэйшай школы Беларусі (1959—1975 гг.): гістарыяграфія і крыніцы ........ 24

*Каспяровіч А. М.* Выкладчыцкія кадры сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Савецкай Беларусі 20-х гг. XX ст. ........ 27

*Космач А. М.* Кенэдзі і Югаславія: асноўныя напрамкі знешнепалітычных падыходаў ........ 34

***Філасофія***

*Пацюкі А. А.* Асаблівасці інтэрпрэтацыі і разумення мастацкага тэксту ў постструктуралісцкай перспектыве ........ 43

*Красюк У. Ф.* «Сфумата» Леанарда да Вінчы скрозь прызму метафізікі ........ 46

***Паліталогія***

*Ільін М. В.* Механізм рэалізацыі кадравай палітыкі дзяржаўнай службы ў Рэспубліцы Беларусь ........ 48

*Гілеўская Л. П.* Палітычныя тэхналогіі: падыходы, сутнасць, умовы ўжывання ........ 52

***Сацыялогія***

*Раманава С. П.* Інавацыйныя тэхналогіі выкладання сацыялогіі ...... 57

*Новікава С. І.* Фактары грамадзянскай сацыялізацыі моладзі ........ 60

*Князева К. І.* Сетка як арганізацыйны прынцып ........ 64

***Эканоміка***

*Давыдзенка Л. М., Літвінюк А. І.* Стратэгія ўваходжання Рэспублікі Беларусь у сістэму трансгранічных сусветнагаспадарчых сувязей ........ 68

*Анісько А. Г.* Эмпірычная праверка трохкампанентнай мадэлі міжнароднага выбару прадпрымальніцкіх месц ........ 76

*Савіна А. Ф.* Эвалюцыя мадэлей эканамічнага росту ........ 82


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

цэнтральных расійскіх губернях, у сувязі з яго гістарычнымі асаблівасцямі, якія былі звязаны з панаваннем тут польскага элемента ў дваранскім асяроддзі, а таксама з больш высокім узроўнем развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Так паступова, але няўхільна, у самадзяржаўнай Расіі яшчэ перад рэвалюцыяй 1905—1907 гг. ажыццяўлялася фарміраванне элементаў грамадзянскага грамадства. Беларусь у гэтым плане была адным з найбольш актыўных рэгіёнаў.

*Літаратура і крыніцы*

1. *Бусько В. Н.* Экономическая мысль Белоруссии середины XIX — начала XX в. : очерки. Мн., 1990.
2. Эканамічная гісторыя Беларусі / под общ. ред. В. І. Галубовіча, Р. І. Ермашкевіча, Г. П. Бушчык і інш. Мн., 1996.
3. *Woyniłłowicz Edward.* Wspomnienia. 1847—1928. Wilno, 1931.
4. Труды Первого областного съезда сельских хозяев в г. Двинске в 1903 г. Витебск, 1904.
5. Устав Минского общества сельского хозяйства. Утв. 20. Авг. 1876 г. Спб., 1877.
6. *Бацяеў В. Ф.* Грамадскія сельскагаспадарчыя аб'яднанні беларусаў у XIX ст. // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2000. № 2. С. 79—84.
7. *Грабовский Б. С.* Краткий очерк двадцатипятилетней деятельности Минского общества сельских хозяев, состоящего под августейшим покровительством... великого князя Владимира Александровича. Мн., 1901.
8. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко [і інш.]; Мн., 2002.
9. *Яновский И. В.* Краткий обзор деятельности сельскохозяйственных обществ в Могилевской губернии за 1915 г. Могилев, 1918.
10. Отчет о действиях Общества витебских сельских хозяев и состоящих в его ведении земледельческих кружков за 1900 г. Витебск, 1901.
11. Отчет могилевского общества сельского хозяйства за 1910 г. Могилев, 1911.
12. Обзор Гродненской губернии за 1903 год. Гродно, 1904.
13. *Цвікевіч А.* «Западно-руссизм» : нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. 2-е выд., Мн., 1993.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 242, воп. 1, спр. 2485.
15. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 12 дек. 1893 г. Мн., 1893.
16. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 6 марта 1894 года. Мн., 1894.
17. Великая реформа: Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем. В 6 т. М., 1911. Т. 6.
18. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 25—26 сентября 1905 года. Мн., 1905.
19. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 5—6 марта 1906 года. Мн., 1906.
20. *Свенцицкий Г. И.* Аграрный вопрос. Доклад Г. И. Свенцицкого Минскому сельскохозяйственному Обществу 5 марта 1906 г. : пер. с польск. СПб., 1906.
21. В Виленском обществе сельского хозяйства // Свободное слово. 1906. 19 сент.
22. По Северо-Западному краю // Могилевский вестник. 1906 г. 15 июня.
23. *Фризендорф Т.* К аграрному вопросу // Голос провинции. 1906. 13 авг.
24. *Lopacinski S.* Sprawa włościańska na Litwe i Białej Rusi // Gazeta Wilenska. 1906. 2.03
25. *Dymsza H.* Poslowie nasi o sprawie agrarnej // Kurjer Litewski. 1906. 9.05.
26. *Skirmunt R.* Poslowie nasi o sprawie agrarnej // Kurjer Litewski. 1906 9. 05.
27. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 10 декабря 1906 года. Мн., 1907.

*Summary*

*The article dwells on the problems connected with association activities of rural masters of north-western Kraj at the end of the XIX-th and the beginning of the XX-th centuries.*

*Much attention is being paid to revealing of subject initiating and members' participation in formation of civil consciousness and civil society in Belarus, of their economic and political activity.*

РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ

---

*УДК 947.072.5*

***І. А. Груца***

# ГІСТОРЫЯ ПОШУКАЎ «СКАРБАЎ НАПАЛЕОНА» НА Р. БЯРЭЗІНЕ

Сваім узнікненнем тэрмін «скарбы Напалеона» абавязаны рабаванню Масквы войскамі Вялікай арміі падчас Айчыннай вайны 1812 г. Паколькі старажытная сталіца Рускай дзяржавы была здадзена без бою, гарадскія ўлады не паспелі поўнасцю эвакуіраваць вялікія каштоўнасці, якія захоўваліся ва ўрадавых установах і праваслаўных храмах маскоўскага Крамля [1, л. 18].

Пакуль у Напалеона заставалася надзея на заключэнне міру з расійскім імператарам Аляксандрам І, ён не дазваляў рабаваць

Крэмль. Больш таго, гвардзейцы адстаялі яго падчас знакамітага маскоўскага пажару. Але надзеі на мір не збыліся. Тады Напалеон аддае загад рыхтавацца да адступлення і канфіскаваць з Аружэйнай Палаты і крамлёўскіх храмаў усе каштоўнасці. Тая іх частка, якая павінна была служыць наглядным доказам пакарэння Масквы, атрымала назву «маскоўскія трафеі». У іх лік увайшлі святыні праваслаўнага хрысціянства, якія захоўваліся ва Успенскім і Архангельскім храмах, а таксама гісторыка-культурныя рэліквіі Расійскай імперыі з фондаў Аружэйнай Палаты [2, с. 202—203].

Да маскоўскіх трафеяў можна аднесці зліткі золата і серабра, у якія быў пераплаўлены сярэбраны посуд, вышыванае золатам і серабром адзенне свяшчэннаслужыцеляў і г. д. На сцяне Успенскага сабора Крамля, каля якога стаялі плавільныя горны, застаўся зроблены мелам надпіс на французскай мове: «325 пуд. серебра и 18 пуд. золота» [3, с. 140].

Акрамя маскоўскіх трафеяў, да каштоўнасцей і воінскіх рэліквій Вялікай арміі адносяцца яе казна, сцягі, прадметы з імператарскага абозу і асабістая здабыча салдат. Усе гэтыя каштоўнасці вядомы пад агульнай назвай «скарбы Напалеона». Іх лёс з'яўляецца апошняй і самай інтрыгуючай тайнай Айчыннай вайны 1812 г.

Пошукі маскоўскіх трафеяў Напалеона і іншых каштоўнасцей, награбленых яго войскам падчас ваеннай кампаніі 1812 г., пачаліся адразу пасля заканчэння ваенных дзеянняў і працягваюцца па сённяшні дзень. Сярод шматлікіх версій іх лёсу ёсць і тыя, якія маюць адносіны да Беларусі. Найбольш вядомая сярод іх звязана з месцам сутычкі пры пераправе напалеонаўскіх войскаў праз р. Бярэзіну 26—28 лістапада 1812 г.

Першыя звесткі аб тым, што падчас пераходу Вялікай арміі праз Бярэзіну ў самой рацэ, а таксама ў Студзёнцы і ў наваколлі Барысава было пакінута і закапана шмат скарбаў, з'явіліся адразу пасля пераправы. У пачатку лютага 1813 г. у Студзёнку па загадзе Аляксандра I накіроўваецца ваенны саветнік Заваратkoў. Яму даручалася праверыць верагоднасць паведамлення аб затапленні ў рацэ французскай ваеннай казны.

Па прыездзе ў Студзёнку Заваратkoў спачатку абследаваў пераправу. Па яго сведчанні, верхні мост быў спалены, а ніжні цалкам захаваўся. На працягу 3—10 лютага сяляне высякалі палонкі і даследавалі дно ракі жэрдкамі. Яе глыбіня ў раёне мастоў была невялікая, і пясчанае дно праглядвалася вельмі выразна. На ім і ў ільдзе знайшлі мноства трупаў, коней, стрэльбаў, шаблі, пісталеты, цесакі, штыкі і шмат дробных прадметаў, у тым ліку «два небольших куска от серебряных образных окладов». Аднак ніякіх слядоў павозак з казной знайсці не ўдалося [4, л. 1—6].

Заваратkoў пачаў роспыты мясцовых жыхароў, спадзеючыся атрымаць ад іх дадатковую інфармацыю. Яму ўдалося адшукаць у Студзёнцы селяніна Сазона Капытка, які расказаў, што «стоя на берегу, видел, как одна повозка, запряженная тройкой лошадей, была с моста сброшена и когда лошади доплыли до берега, за крутизною вылезти не могли и тогда с повозкою утонули». На адзначаным ім месцы высеклі некалькі палонак, але ніякіх слядоў павозкі не знайшлі.

Аб пошуку, па асабістым загадзе Аляксандра I французскай ваеннай казны, хутка стала вядома ў навакольных вёсках. 8 лютага 1813 г. на імя Заваратkoва быў пададзены рапарт двараніна Радзевіча, чый маёнтак знаходзіўся недалёка ад Студзёнкі. Ён паведаміў, што падчас адступлення фрацузскіх войскаў апынуўся разам з імі ў Вільні і там даведаўся ад аўстрыйскага афіцэра аб затапленні на месцы пераправы бочачкі з сярэбранымі манетамі.

Паказанні Радзевіча неадкладна праверылі, але ў адзначаным ім месцы са дна ракі паднялі толькі кавальскі інструмент. Больш дэталёва абследаваць дно Бярэзіны не ўдалося. Пачалася адліга, лёд стаў раставаць і адыходзіць ад берага. Далейшае правядзенне работ ставіла пад пагрозу жыццё сялян, якія высякалі палонкі, таму іх спынілі. Пазнейшыя пошукі французскай ваеннай казны падрабязна апісаны ў рапарце на імя графа Аракчэева. У ім Заваратkoў паведамляў, што да 24 лютага знаходзіўся ў сяле Крычын і займаўся вобыскам маёнтка Радзевіча і навакольных вёсак з мэтай выяўлення «таких повозок и бочонков, какие были под денежною казною». Яму ўдалося знайсці ў вёсцы Малая Трасцяніца перадок з коламі ад грашовай павозкі і тры бочачкі. На іх дне выразна віднеліся павыцісканыя літары WS, HS і n, а таксама рымскія лічбы VIII і XX. На аснове гэтага Заваратkoў зрабіў выснову, што ў бочачцы з літарамі HS знаходзіліся галандскія манеты: WS — вюртэмбергскія, n — напалеондоры (Souverain) ці чырвонцы, рымскія ж лічбы маглі абазначаць тысячы.

Дапытаныя сяляне паказалі, што бочачкі належалі іх аднавяскоўцам, якія не так даўно памерлі ад тыфу. Бочачкі былі канфіскаваны і перададзены на захоўванне барысаўскаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спраўніку Сакалову. Яму ж прадпісвалася назіраць за сялянамі вёскі Малая Трасцяніца, і калі яны пачнуць мяняць замежныя манеты на рускія грошы, адразу паведаміць пра гэта барысаўскаму гараднічаму Шаталаву.

Вясной 1813 г. аказалася, што затанулыя на пераправе павозкі перашкаджаюць суднаходству па Бярэзіне. Па распараджэнні ведамства шашэйных і вадзяных сувязей для расчысткі рэчышча была накіравана воінская каманда, салдаты якой дасталі з затанулых павозак мноства скрынь, ранцаў і іншых прадметаў. Наведаўшаму Студзёнку ўрачу вюртэмбергскага корпуса Росу, які трапіў у палон на Бярэзіне, маёр, што камандаваў салдатамі, дэманстраваў вялікую колькасць знойдзенага ў скрынях золата, серабра і каштоўнасцей. Самі ж салдаты хваліліся Росу гадзіннікамі, пярсцёнкамі і іншымі рэчамі з золата і серабра [5, с. 153].

Частка каштоўнасцей і рэчаў дасталася мясцовым сялянам, якія прадавалі іх сваім памешчыкам за бясцэнак. Так, уладальніку маёнтка Стара-Барысаў Корсаку ўдалося сабраць найбагацейшую калекцыю трафейнай зброі, ордэнаў і медалёў усіх нацый часоў Айчыннай вайны 1812 г.

Многія сяляне навакольных вёсак насілі воінскія мундзіры, знойдзеныя ў пакіданых павозках, а то і пазніманыя з загінуўшых салдат. Па берагах валяліся кірасы, абломкі шпаг, палашоў, стрэльбаў, каскі, ядры, карцеч, кулі. Усяму гэтаму жалезу знайшлося прымяненне ў сялянскіх гаспадарках. Са шпаг, палашоў і шабель у мясцовых кузнях выкоўвалі кухонныя нажы, з кірас атрымліваліся цудоўныя скавародкі. Асабліва цаніліся ў мясцовых жыхароў ручныя млыны, якія выкарыстоўваліся французамі для вырабу мукі буйнога памолу. Цэлая партыя такіх млыноў была спецыяльна выраблена ў Францыі і трапіла ў армію [6, с. 97—98]. Нядзіўна, што сяляне Студзёнкі і навакольных вёсак гадоў дваццаць пасля пераправы не куплялі жалеза для гаспадарчых патрэб, выкарыстоўваючы тое, што засталося на месцах баёў [7, с. 618].

Разам з абломкамі жалеза часта здараліся і больш каштоўныя знаходкі. Вядома, што ў кастрычніку 1813 г. зусім выпадкова ў рацэ знайшлі два вялікія кускі серабра, якія пазней былі перададзены ў Мінскі кафедральны сабор [8, л. 1—5]. На працягу многіх гадоў сяляне пастаянна знаходзілі ў Бярэзіне разнастайныя прадметы.

Так працягвалася да 60-х гг. XIX ст., пакуль у адно вельмі засушлівае лета на месцы былой пераправы не села на мель некалькі плытоў, якія сплаўлялі ў Барысаў. Паступова іх занёс пясок, і яны ператварыліся ў надзейны панцыр над астаткамі напалеонаўскіх мастоў і застаўшыміся ў рацэ прадметамі [9, с. 178]. Пасля гэтага колькасць знаходак рэзка скарацілася, і аб месцы пераправы сталі паступова забываць.

Калі адносіны паміж Расіяй і Францыяй нармалізаваліся, у Міністэрства замежных спраў сталі паступаць прашэнні ад уцалелых пры пераправе праз Бярэзіну ветэранаў Вялікай арміі з просьбай дазволіць пошук схаваных там каштоўнасцей. Так, тры чалавекі з вялікага герцагства Бадэнскага, 45-гадовы абіўшчык з Ульма Якаў Кенінг у суправаджэнні двух суайчыннікаў і прыкамандзіраванага да іх ад'ютанта начальніка галоўнага штаба гвардыі капітана Фрэдэрыкса выязджалі на месца пераправы ў Студзёнку ў лістападзе 1823 г. Кенінг сцвярджаў, што недзе там ён разам з таварышамі закапаў чатыры бочкі з золатам. Пошукі скончыліся безвынікова. Карыстаючыся планам, які ў яго захаваўся, Кенінг вызначыў раён пошукаў, але знайсці скарбы не змог [10].

Наступная гісторыя мела адносіны да вялікага скарбу манет, закапанага ў лістападзе 1812 г. недзе каля Барысава. Яе пачатак паклала выпадковая знаходка пісьма дваранінам Сочынскім на адной з дарог у Кіеўскай губерні. Яно было адрасавана ігуменам Чарнобыльскага дамініканскага манастыра ксяндзом Гуліцкім ігумену Кіеўскага каталіцкага манастыра Галаўне. Са зместу пісьма стала зразумела, што яго напісаў нейкі Сенкевіч, паведаміўшы Гуліцкаму аб скарбе, закапаным каля Барысава. Апошні, даведаўшыся аб скарбе, угаварыў Сенкевіча не расказваць нічога ўраду, а тайна выкапаць грошы і перадаць іх на пабудову ў Кіеве дамініканскага манастыра і ўтрыманне яго свяшчэннаслужыцеляў [11, л. 71—79].

У маі 1830 г. расійскі пасланнік у Парыжы граф П. Борга выдаў пашпарты на ўезд у Расію двум парыжанам — літаратару Жакасу і ўладальніку нерухомасці Шэну для пошукаў бочкі з залатымі, сярэбранымі манетамі і каштоўнасцямі, закапанай на беразе Бярэзіны. Рэвалюцыя 1831 г. у Францыі сарвала планы шукальнікаў скарбаў. У сакавіку таго ж года Жакас перадаў П. Борга план закапаных скарбаў, патрабуючы палову з іх. Усе даныя пра скарб былі перададзены ў 2-е аддзяленне жандармерыі. Чым скончыліся яго пошукі і ці праводзіліся яны наогул — невядома [10].

Прыблізна ў гэты ж час на Бярэзіне падпалкоўнік жандармскага корпуса Кільчэўскі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адстаўны палкоўнік Мацкевіч правяралі верагоднасць звестак паплечнікаў Напалеона, нейкага Лаверанта Шарпіна, аб месцы захавання скарбаў. У суправаджальным пісьме за подпісам шэфа корпуса жандармаў Бенкендорфа гаварылася, што Кільчэўскі пасланы «для розыска денег и сокровищ, якобы закопанных некоторыми французами при переправе через Березину в 1812 году», і прадпісвалася аказваць яму любое садзеянне [10].

Пасля гэтага, па сведчанні мясцовага памешчыка Тышкевіча, на пераправу неаднаразова прыязджалі замежныя грамадзяне ў суправаджэнні прадстаўнікоў мясцовай улады. У пошуках скарбаў яны карысталіся старымі картамі і планамі, але знайсці што-небудзь ім удавалася рэдка, бо мясцовасць за прайшоўшы час моцна змянілася [6, с. 99—100].

Зноў загаварылі аб напалеонаўскіх скарбах у Барысаўскім павеце ў сярэдзіне 90-х гг. XIX ст., калі жыхар Барысава Юліян Рачкоўскі звярнуўся да ўлад з просьбай дазволіць яму пошукі золата, награбленага французамі. Аб гэтым скарбе Рачкоўскі даведаўся ад ветэрана Вялікай арміі Іахіма, які памёр у іх доме ў 1836 г. Па словах Іахіма, у лістападзе 1812 г. яму з таварышамі ўдалося захапіць павозку з васьмю бочачкамі залатых манет, якія былі схаваны на беразе Бярэзіны [12, л. 3].

Толькі ў 1895 г. Рачкоўскі дабіўся права на правядзенне пошукаў скарбу, але яны скончыліся безвынікова.

У канцы XIX ст. селянін са Студзёнкі Лука Нікіфараў сцвярджаў са слоў свайго бацькі, што пасля адыходу французаў усе сем калодзежаў у вёсцы аказаліся засыпанымі. Калі сяляне адшукалі адзін з іх і паспрабавалі расчысціць, то аказалася, што ён быў поўнасцю забіты ядрамі, карцеччу і іншай ваеннай амуніцыяй. Астатнія калодзежы не знайшлі, бо яны поўнасцю зраўнаваліся з узроўнем зямлі. Гэтыя калодзежы прыязджаў шукаць нейкі ляснік, памяць аб якім захавалі старажылы, якія аказвалі яму дапамогу. Ён сцвярджаў, што ў адным з калодзежаў французы схавалі 12 бочачак з золатам [7, с. 613].

Член гістарычнага таварыства «Апекуны памяці Айчыннай вайны 1812 года» генерал Харкевіч неаднаразова прыязджаў у Студзёнку ў канцы XIX ст., і кожны раз сяляне прапаноўвалі яму набыць на памяць 1—2 залатыя манеты, якія яны называлі «эмпльсонамі» і ацэньвалі ў 15—17 рублёў. Ён жа паведаміў пра вялікі скарб залатых і сярэбраных манет, знойдзены непасрэдна ў вёсцы [9, с. 178].

Самай жа вядомай знаходкай у раёне пераправы быў скарб паміж вёскамі Вялікае Стахава і Брылі на правым беразе Бярэзіны. Менавіта там праходзілі бязлітасныя баі на подступах да пераправы. Праз пэўную колькасць гадоў у гэтай мясцовасці набыў участак зямлі селянін Філімонаў. Аднойчы, карчуючы лес пад раллю, ён выпадкова натыкнуўся на французскую кірасу, напоўненую залатымі манетамі. Аб гэтай знаходцы доўга гаварылі па ўсім павеце [7, с. 619—620].

Наступны этап пошукаў напалеонаўскіх скарбаў на Бярэзіне непасрэдна звязаны з гісторыяй апошняга афіцэра Вялікай арміі Жана Баціста Савена. Паступіўшы на воінскую службу ў 29 гадоў, ён прыняў удзел у паходзе напалеонаўскай арміі ў Егіпет, ваяваў у Іспаніі, а ва ўзросце 43 гадоў прыняў удзел у паходзе на Маскву, перажыў усе жахі адступлення Вялікай арміі да Бярэзіны.

Падчас пераправы Савену даручылі ахоўваць павозкі з казначэйствам Галоўнага штаба, налічваўшым каля 4 млн франкаў. Яго павозкі трапілі на мост у ліку апошніх, з ар'ергардам маршала Віктора. К гэтаму часу варта пераправы была ўжо знята, і назіраць за парадкам было некаму. Так здарылася, што на мост разам з павозкамі казначэйства уз'ехала некалькі гармат цяжкай артылерыі. Не вытрымаўшы цяжару, некалькі яго пралётаў праваліліся, і казна апынулася ў вадзе. Савен з цяжкасцю выбраўся на бераг і трапіў у палон. Хутка яго адправілі ў Яраслаўль, а потым у Саратаў, дзе ён і застаўся жыць. Гісторыя жыцця Савена была апублікавана ў 1894 г. і атрымала шырокі рэзананс не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе [12, с. 198].

Расказ Савена аб утопленай казне Вялікай арміі ў Бярэзіне выклікаў новую хвалю інтарэсу да «скарбаў Напалеона». Невыпадкова ў 1896 г. па распараджэнні Міністра шляхоў зносін прымаецца рашэнне аб расчыстцы дна на Бярэзіне, у тым ліку на месцы пераправы [13, л. 12—26].

Работы землечарпалкі пачаліся ў канцы лета таго ж года, калі ўзровень вады ў рацэ моцна панізіўся. Праз некаторы час па наваколлі папаўзлі самыя неверагодныя чуткі аб знойдзеных на дне ракі скарбах: залатых і сярэбраных манетах, каштоўных прадметах, штандарах, зброі і нават «костяке французского кирасира в полном вооружении».

Мясцовыя ўлады былі вымушаны правесці расследаванне, вынікам якога з'явіўся рапарт барысаўскага павятовага спраўніка мінскаму губернатару з пералікам знаходак на месцы работы землечарпалкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З вопісу прадметаў вынікае, што ніякіх скарбаў са дна Бярэзіны паднята не было, а знойдзеныя рэчы ўяўлялі толькі музейны інтарэс. Аднак паказанні прадстаўніка «Гуртка апекуноў памяці Айчыннай вайны 1812 года» генерала В. І. Харкевіча сведчаць, што залатая французская пячатка была прададзена карчмару, мясцовы памешчык набыў пару пісталетаў, яшчэ нехта набыў шпагу з залатым эфесам і г. д. [9, с. 179]. Ды і самі сяляне небеспаспяхова абшуквалі выгружаемы з шаландаў рачны глей і пясок. Больш за ўсіх пашанцавала дачцэ селяніна Філончыка. Яна прыцягнула дадому пакрыты граззю ланцуг. Першапачаткова на яго ніхто не звярнуў увагі, але калі гразь абсохла і адпала, ланцуг заззяў золатам. Аднак у той жа дзень яго забраў у Філончыка ў якасці доўгу млынар [14].

У пачатку 60-х гг. ужо нашага стагоддзя на берагі Бярэзіны ў Студёнку прыбыла новая экспедыцыя, арганізаваная Дзяржаўным краязнаўчым музеем БССР з мэтай «поиска снаряжения, вооружения и др. предметов, оставленных отступавшей французской армией Наполеона».

Пад гэтай, некалькі расплывучатай фармулёўкай арганізатары экспедыцыі, напэўна, мелі на ўвазе пошук затопленых у рацэ маскоўскіх трафеяў Вялікай арміі. Ва ўсякім выпадку, хоць іх пошук, як вынікае са справаздачы экспедыцыі, і не ставіўся яе галоўнай мэтай, але дастаткова яўна меўся на ўвазе [14, л. 1—24]. Інакш чым можна растлумачыць размах запланаваных пошукавых работ, да выканання якіх прыцягваліся сапёры з міна-шукальнікамі, вадалазы, земснарад і школьнікі для правядзення раскопак. Вынікі работы дадзенай экспедыцыі павінны былі канчаткова пацвердзіць ці абвергнуць праўдзівасць легенды аб затапленні ў Бярэзіне маскоўскіх трафеяў і казны Вялікай арміі.

Найбольш паспяховымі сталі раскопкі французскіх пазіцый у наваколлі вёсак Студёнка, Брылі, Касцюкі, якія вяліся з першага і да апошняга дня экспедыцыі. Дзякуючы ім, удалося знайсці 16 гузікаў, 6 манет, латунны жэтон з выявай кароны ў абрамленні сцягоў і стужак, некалькі ядзер рознага калібру. На пяці гузіках меліся нумарныя знакі: 3; 4; 25; 37; 56, якія ўказвалі на прыналежнасць да пэўных падраздзяленняў Вялікай арміі. На астатніх гузіках мелася выява аднагаловага арла з каронай і перакрыжаваных гармат, дзвюх перакрыжаваных гармат і ядра з падпаленым кнотам над імі.

Са знойдзеных манет адна была французская з надпісам па акружнасці, тры — прускія вартасцю ў 1/12 талера 1767, 1768 і 1783 гадоў выпуску, дзве рускія манеты часоў праўлення імператрыц Лізаветы (грош 1744 г.) і Кацярыны II.

Звесткі аб знаходках такога кшталту на месцы пераправы з'яўляліся ў розных перыядычных выданнях яшчэ з канца XIX ст. Так, старшыня камітэта па арганізаванні музея Айчыннай вайны 1812 г. палкоўнік В. А. Афанасьеў у самой Студзёнцы набыў французскую пячатку з літарамі A і G [15]. Такімі знаходкамі камплектаваліся і экспазіцыі розных беларускіх музеяў. У 1909 г. член мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта Н. П. Шыдлоўская, пабываўшы ў Студзёнцы, набыла ў сялян французскія гузікі, манеты, шпору і г. д. [16, с. 238].

Вывучэнне гісторыі пошукаў «скарбаў Напалеона» на Бярэзіне дазваляе меркаваць, што тут вяліся пошукі скарбаў, пакінутых салдатамі Вялікай арміі, а не маскоўскіх трафеяў Напалеона. Няўдача ў іх пошуках была абумоўлена, па-першае, гіпертрафіраванай верай у праўдзівасць сведчанняў ветэранаў Вялікай арміі, па-другое, абсалютызацыяй геаграфічнага фактару. Інакш кажучы, пошукі вяліся на аснове сведчанняў ветэранаў Вялікай арміі, якія не падвяргаліся крытычнаму асэнсаванню, або ў тых вадаёмах, якія знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад галоўнай дарогі адступлення напалеонаўскіх войскаў.

*Літаратура*


1. РДГА, ф. 797, воп. 1, спр. 4449.
2. Histoire de la campagne de Russie pendant l'annee 1812 et de la captivite des prisonniers francais en Siberie et dans les autres provinnces de l'empire precedes l'un hesome de l'Histoire de Russie par Emile Marco de Saint-Hilaire. Paris 1834—1836. Tome deuxieme.
3. Москва в 1812 году. М., 1910.
4. РДГА, ф. 1409, воп. 1, спр. 1409.
5. *Доктор Роос.* С Наполеоном в Россию. Воспоминания врача о походе 1812 года. СПб., 1832.
6. *Tyszkewicz E.* Opisanie poviatu Borisowskiego. Wilno, 1847.
7. *Альбовский Е.* Клады по берегам реки Березины // Исторический вестник. 1898. Ч. 2.
8. РДГА, ф. 1286, воп. 2, спр. 91.
9. *Харкевич В. И.* Поездка в Студенку // Исторический вестник. 1897. Ч. 4—6.
10. *Башкина.* Где спрятана «московская добыча?» // Неделя. 1967. № 2.
11. ЦГАОР, ф. 109, 2-я экспедыцыя 1828 г., воп. 58, спр. 326.
12. *Военский К.* Исторические очерки и статьи, относящиеся к 1812 году. М., 1912.
13. НГА РБ, ф. 295, воп. 1, спр. 6151.
14. *Мазинг Г.* «Где искать сокровища Наполеона?» // Советская культура. 1984. 11 февр.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ